*Рыхтуючыся да 50-годдзя з дня ўтварэння Саюза ССР, наша газета працягвае знаёмства з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Краіны Саветаў. Сёння ў нас у гасцях Кіеўскі ордэна Леніна дзяржаўны універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі.*

# КІЕЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ



## МОВАЙ ФАКТАЎ

● **138-годдзе з дня заснавання будзе святкаваць у гэтым годзе Кіеўскі ордэна Леніна дзяржаўны універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі.**

● **За 83 дарэвалюцыйныя гады наш універсітэт падрыхтаваў усяго каля 20 тысяч спецыялістаў.**

**У савецкі перыяд сваёй гісторыі універсітэт штогод даваў краіне ў сярэднім 1000 высокакваліфікаваных спецыялістаў.**

● **Каля 19 тысяч 800 студэнтаў вучыцца цяпер у нашым універсітэце, з іх толькі на стацыянары — каля 8 тысяч 400 чалавек.**



У студэнтаў-геолагаў — практычныя заняткі па петраграфіі.

КІЕЎСКІ ОРДЭНА Леніна дзяржаўны універсітэт імя Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі — адна з самых старых вну нашай краіны. У гэтым годзе мы будзем святкаваць 138-годдзе з дня яго заснавання.

Мы хочам расказаць аб тым, чым жыве наш універсітэт, якія задачы пастаўлены партыяй і народам перад калектывам вядучай вну Украіны і аб тым, як гэтыя задачы шаўчэнкаўцы вырашаюць.

У сваім дакладзе на XXIV з'ездзе КПСС Леанід Ільіч Брэжнеў дакладна вызначыў задачы сістэмы народнай адукацыі ўвогуле і універсітэцкай у прыватнасці, якія прадстаіць вырашыць у дзевятай пяцігодцы. Выкананне планаў дзевятай пяцігодкі— агульная справа партыі і народа. І савецкае студэнцтва павінна ўнесці свой уклад у гэтую вялікую справу. Безумоўна, што і на людзей з універсітэцкім значком на грудзях прыпадзе значная доля здзяйсненняў у гэтай пяцігодцы.

У шаўчэнкаўскім універсітэце, як і ў іншых, студэнты вывучаюць і прыродазнаўчыя і гуманітарныя навукі. Сучаснае ўзаемапранікненне навук адлюстроўваецца ў дзейнасці розных факультэтаў, якія працуюць у цеснай садружнасці. У нашым універсітэце, напрыклад, нікога не здзіўляе, што матэматыку вывучаюць не толькі студэнты прыродазнаўчых факультэтаў, але і будучыя філосафы, эканамісты, філолагі.

На ўсіх факультэтах паглыблена вывучаецца цыкл грамадскіх дысцыплін — гісторыі КПСС, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, палітычнай эканоміі, асноў навуковага камунізму. Універсітэт дае свайму выхаванцу не толькі веды па спецыяльнасці — ён дае таксама ідэйную загартоўку, фарміруе ў яго марксісцка-ленінскі светапогляд, выхоўвае актыўнага барацьбіта за пабудову камуністычнага грамадства, будучага кіраўніка мас, палымянага прапагандыста ленінскіх ідэй.

Высокакваліфікаваныя прафесары і дацэнты, перадаючы студэнтам свае веды і вопыт, перш за ўсё клапоцяцца аб тым, каб выпускнік мог прыняць удзел у працы пэўнага калектыву не толькі адразу ж пасля заканчэння вну. Задача заключаецца ў тым, каб даць студэнту веды на такім сучасным навуковым узроўні, з такой перспектывай, каб у бліжэйшыя гады пасля заканчэння універсітэта яму не прыйшлося перавучвацца ў сілу таго, што атрыманыя веды ў вызначанай галіне навукі, якую ён выбраў сваёй прафесіяй, безнадзейна устарэлі. Улічваючы бурнае развіццё навукі і тэхнікі, выкладчыкі стараюцца даць як мага больш навейшай навуковай інфармацыі.

Але і гэтых ведаў, нават ідэальна засвоеных, недастаткова для таго, каб у далейшым працаваць без іх папаўнення. Таму выкладчыкі нашага універсітэта спрабуюць рашыць і яшчэ адну важную задачу — абудзіць неўтаймаваную прагу да пошукаў.

Такі творчы агеньчык запальвае ў сэрцах нашых студэнтаў работа ў шматлікіх гуртках навуковага студэнцкага таварыства, работа над курсавымі і дыпломнымі, над дакладамі на навуковых канферэнцыях, рэфератамі.

Вось некаторыя даныя аб удзеле нашых студэнтаў у навуковай рабоце. На ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх работ па грамадскіх дысцыплінах і на лепшую работу ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук нашы студэнты заваявалі 10 медаляў, 3 граматы і заслужылі 7 падзяк. Сорак адно навуковае даследаванне прынята і ўкаранёна. А агульны лік студэнтаў нашага універсітэта, якія займаюцца навуковай работай, складае каля 3500 чалавек.

Навуковая праца ва універсітэце цесна звязана з вучобай. Гэта складаемыя адзінага працэсу выхавання будучага спецыяліста.

У адказ на патрабаванні айчыннай навукі ў нашым універсітэце адкрываюцца ўсё новыя спецыялізацыі. Так, у апошні час у нас былі адкрыты спецыялізацыі «Тэарэтычная кібернетыка» і «Эканамічная кібернетыка», на філасофскім факультэце — новае аддзяленне псіхалогіі, на філалагічным — аддзяленне славянскай філалогіі. Арганізаван таксама новы факультэт — міжнародных адносін і міжнароднага права.

Цяжка пералічыць праблемы, якія хвалююць і паспяхова вырашаюцца калектывам навуковых работнікаў шаўчэнкаўскай вну. Навуковыя працы нашых вучоных шырока вядомы за межамі нашай Радзімы, неаднаразова атрымлівалі прызнанне на выстаўках, сімпозіумах, міжнародных кангрэсах, публікаваліся ў савецкіх і зарубежных навуковых выданнях. Вучоныя з многіх зарубежных краін праходзілі і праходзяць стажыроўку на кафедрах і ў лабараторыях нашага універсітэта.

Працягваючы паспяхова развіваць фундаментальныя навуковыя даследаванні, вучоныя нашага універсітэта працуюць і ў галіне прыкладнога прымянення іх вынікаў. Сёння можна ўжо гаварыць аб шырокім вынаходніцкім актыве, які налічвае каля ста вучоных і інжынерна-тэхнічных работнікаў універсітэта.

У мінулым годзе нашы вучоныя атрымалі паведамленне аб прызнанні вынаходніцтвамі 22 прапанаваных імі тэхнічных рашэнняў. А ўжо ў гэтым годзе універсітэт атрымаў 16 пасведчанняў аб вынаходніцтвах, кожнае з якіх характарызуецца сталасцю тэхнічнай думкі, істотнай навізной у сваёй галіне і ўяўляе значны інтарэс для прамысловых прадпрыемстваў і устаноў.

Хутка ў нашым універсітэце закончыцца навучальны год, і сотні маладых спецыялістаў выйдуць з яго сцен на шырокую дарогу жыцця. Вну дала ім усё неабходнае для таго, каб яны сталі актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства. І мы ўпэўнены ў тым, што ўклад іх у гэтую высакародную справу будзе важкім і карысным.

# РАЎНЕННЕ НА БУДУЧАЕ

## АРСЕНАЛ ТСН

Наш універсітэт мае ў наяўнасці вялікі арсенал тэхнічных сродкаў навучання. На змену прывычнай шматгадзіннай лекцыі прыйшлі кіно і кадаскоп, навучаючыя машыны і дыяпраектар, мікрафот і кінапраектар. Цяпер наўрад ці можна знайсці ва універсітэце выкладчыка, які б не выкарыстоўваў у сваёй працы гэтыя неабходныя тэхнічныя сродкі. Праграміраваныя і навучаючыя машыны занялі трывалае месца ў аўдыторыях, як, напрыклад, класная дошка ў школе. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у навучальным працэсе дазволіла перш за ўсё пашырыць межы аўдыторый, дало магчымасць студэнтам зазірнуць у глыбіні сваёй будучай прафесіі.

Вось ужо больш сямі год у нашым універсітэце працуе навукова-метадычны кабінет тэхнічных сродкаў навучання (ТСН). Стварэнне яго дазволіла выкладчыкам і студэнтам праводзіць даследаванні і весці навукова-метадычную работу па пытаннях выкарыстання ТСН у інстытутах і школах нашай рэспублікі.

Работа кабінета вядзецца ў пяці напрамках. Да яе падключыліся універсітэцкія вучоныя, якія маюць грунтоўныя веды і вопыт. Супрацоўнікі кабінета ўважліва сочаць за навінкамі кінапраекцыйнай і тэхнічнай апаратуры. Да паслуг выкладчыкаў — самае сучаснае абсталяванне.

З вялікай асцярожнасцю і ўважлівасцю ўключалі выкладчыкі тэхнічныя сродкі навучання ў лекцыйную праграму. Цяжка і складана было мяняць даўнюю форму лекцыйнай работы, якая мае глыбокія карэнні і традыцыі. Пераадолеўшы гэтыя цяжкасці, супрацоўнікі кабінета ТСН сталі не толькі памочнікамі выкладчыкаў, але і выхавацелямі студэнтаў.

Метадычны сектар кабінета ТСН сумесна з кафедрамі універсітэта састаўляе планы выпуску кінафрагментаў і кінаролікаў па розных дысцыплінах і па сцэнарыях, напісаных выкладчыкамі і аспірантамі. Больш 800 лекцый у год з выкарыстаннем розных экранных дапаможнікаў—такі вынік работы кабінета ТСН.

Інжынерная група кабінета занялася нядаўна абсталяваннем аўдыторый універсітэта тэлевізійнымі ўстаноўкамі і аўтаматычнай сувяззю паміж выкладчыкам і студэнтамі, дэканам і рэктаратам. Уся работа гэтай сістэмы будзе здзяйсняцца з адзінага пульта кіравання, устаноўленага ў дэканаце факультэта. Дастаткова націснуць кнопку, і дэкан у любы момант можа гаварыць з выкладчыкам, не перашкаджаючы пры гэтым рабоце студэнтаў. Дэкан зможа таксама па неабходнасці ўключаць камеры, устаноўленыя ў лабараторыях і на кафедрах факультэта. Усё гэта яшчэ прадстаіць зрабіць інжынерам кабінета ТСН.

Расказ аб універсітэцкім кабінеце тэхнічных сродкаў навучання будзе няпоўным, калі мы не ўпамянём аб метадычнай рабоце яго супрацоўнікаў. За апошнія два гады кабінетам было выдадзена пяць метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для праграміраванага навучання. Навуковыя супрацоўнікі кабінета пастаянна выступаюць з навуковымі артыкуламі і метадычнымі рэкамендацыямі ў перыядычным друку і спецыяльных часопісах рэспублікі.

Многа цярпення, сіл і энергіі трэба затраціць для таго, каб будучы інжынер, фізік, педагог, хімік стаў сапраўдным знаўцам сваёй галіны ведаў. Сваю даніну ў падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў уносяць і супрацоўнікі навукова-метадычнага кабінета ТСН.

**А. ФЯСЕНКА,**
**В. ВАДЗЯКОЎ.**



*Даследаванні праводзяць хімікі.* *Фота Н. ЛЯШЭНКІ.*

## МОВАЙ ФАКТАЎ

● **Студэнты 25 нацыянальнасцей Савецкага Саюза вучацца ў нашым універсітэце.**

● **Больш 500 студэнтаў з 57 краін свету авалодваюць выбранымі спецыяльнасцямі на розных факультэтах нашай вну.**

● **Штогод універсітэт праводзіць да 10 навуковых канферэнцый і нарад саюзнага, рэспубліканскага і міжвузаўскага значэння, на якіх абмяркоўваюцца важнейшыя пытанні навукі і культуры.**

● **Вучоныя універсітэта штогод публікуюць каля 2 тысяч навуковых, навукова-папулярных і навукова-метадычных работ.**

● **У 11 інтэрнатах жыве больш 6 тысяч студэнтаў, г. зн. практычна жыллём забяспечаны амаль усе, хто мае патрэбу.**

## МОВАЙ ФАКТАЎ

● **На 16 факультэтах шаўчэнкаўскай вну працуе 131 спецыялізаваная кафедра. Больш 140 лабараторый, навуковых і прадметных кабінетаў — да паслуг студэнтаў.**

● **Больш 2 мільёнаў 260 тысяч тамоў мастацкай і навуковай літаратуры, перыядычных выданняў знаходзяцца ў кнігасховішчах універсітэцкай навуковай бібліятэкі. Сёння яе паслугамі карыстаецца больш 26 тысяч чалавек, якіх абслугоўваюць 150 супрацоўнікаў.**

● **Каля 1300 студэнтаў штогод паляпшаюць сваё здароўе ва універсітэцкім прафілакторыі. 650—700 чалавек адначасова могуць добра адпачыць у трох спартыўна-аздараўленчых лагерах вну.**

# УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Т. Р. ШАЎЧЭНКІ

## ГІСТОРЫЯ РАДЗІМЫ, СЛАВА НАРОДА...

Вось ужо некалькі год ва універсітэце працуе клуб рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. На працягу апошніх пяці год перад членамі клуба выступіла больш шасцідзесяці ветэранаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, правафланговых сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. Бо ніякія кнігі, ніякія лекцыі не параўнаюцца з расказамі непасрэдных вачавідцаў, удзельнікаў знамянальных падзей.

Клуб рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы быў арганізаван у 1967 годзе. Яго першымі членамі сталі студэнты геаграфічнага факультэта. Вялікая заслуга ў стварэнні клуба належыць дацэнту кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Галіне Мяфодзьеўне Крывашэі. Клуб даўно перарос межы аднаго факультэта і стаў агульнауніверсітэцкім. У плане работы — азнаямленне яго членаў з месцамі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы працоўных Кіева і вобласці, усяго савецкага народа. Члены клуба здзяйсняюць паездкі па краіне, арганізуюць гутаркі з ветэранамі рэвалюцыі, воінаў, перадавікамі вытворчасці.

А, зрэшты, запрашаем вас на адно з пасяджэнняў клуба.

Тэма — «Камсамольцы і моладзь Украіны на франтах, у падпольным і партызанскім руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Адкрывае пасяджэнне прарэктар універсітэта прафесар А. З. Жмудскі. Ідзе прадстаўленне гасцей:

— Уладзімір Дзмітрыевіч Лаўрыненкаў! Двойчы Герой Савецкага Саюза, генерал-палкоўнік авіяцыі запасу.

— Аляксей Фёдаравіч Федараў! Двойчы Герой Савецкага Саюза, цяпер міністр сацыяльнага забеспячэння УССР, у гады вайны — сакратар падпольных Чарнігаўскага і Валынскага абкомаў партыі, камандзір легендарнага партызанскага злучэння.

— Мікалай Антонавіч Кузняцоў! Генерал-маёр запасу, у гады вайны — сакратар ЦК камсамола Украіны.

— Васіль Яфімавіч Бандарэнка! Герой Савецкага Саюза, аўтар кнігі «Няма невядомых салдат».

— Аляксандр Елісеевіч Крывец! Герой Савецкага Саюза, былы камандзір партызанскага атрада.

— Платон Мікітавіч Воранько! Лаўрэат Шаўчэнкаўскай прэміі УССР, паэт. У гады вайны—удзельнік вядомага карпацкага рэйду партызанскага атрада пад камандаваннем Каўпака...

І гэта толькі на адным з пасяджэнняў клуба! А яшчэ —паездкі ў Валгаград, Трыполле, Нова-Пятроўцы.

Многім запомнілася паездка ў маі 1970 года ў Валгаград. У складзе дэлегацыі былі лепшыя студэнты універсітэта — выдатнікі Ленінскага заліку, а таксама студэнты з В'етнама і Афрыкі, якія вучацца на геаграфічным факультэце нашага універсітэта. «Незабыўнае падарожжа!»— так ацанілі члены клуба гэтую паездку.

Неабходна адзначыць, што работа клуба носіць інтэрнацыянальны характар. У ёй прымаюць актыўны ўдзел студэнты з розных краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, якія вучацца ў шаўчэнкаўскім універсітэце.

Члены клуба праводзяць і вялікую лекцыйную работу сярод насельніцтва. Яны выязджаюць на прадпрыемствы і ва ўстановы горада і вобласці, знаёмяць сваіх слухачоў з гераічным мінулым савецкага народа. У клубе студэнты набываюць навыкі арганізацыйнай і масава-палітычнай работы сярод моладзі. І як вынік, клуб, падобны на універсітэцкі, нарадзіўся ў школе-інтэрнаце ў Феафаніі, дзе арганізавала яго выпускніца універсітэта К. Ярэма. Студэнты В. Церла і В. Палавінскі арганізавалі такія клубы ў школах, дзе яны праходзілі педагагічную практыку.

За пяць год свайго існавання клуб рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа заваяваў ва універсітэце і за яго сценамі заслужаны аўтарытэт і павагу. Усё больш і больш новых членаў удзельнічае ў яго рабоце, усё больш шырока плануе работу клуба яго савет. Так, напрыклад, нядаўна студэнты вярнуліся з чарговай паездкі, на гэты раз — з горада-героя Брэста. Уражанні аб ёй, роздум, выкліканы гэтым падарожжам, лягуць у аснову новых дакладаў і паведамленняў, застануцца ў душы як незабыўны і яркі ўспамін

**М. КАРСУНСКІ.**





● *Ідуць заняткі ў студэнтаў-гуманітарнікаў.*

● *У вылічальным цэнтры універсітэта.*

Фота **Н. Ляшэнкі.**



● Здаюць залік студэнты фізічнага факультэта.

● Важнае месца ў вучэбнай праграме геалагічнага факультэта Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта адводзіцца гістарычнай геалогіі.

На здымку **Н. Ляшэнкі** вы бачыце студэнтаў-геолагаў у час практычных заняткаў па гэтаму курсу.



## ДА ШТЫКА ПРЫРОЎНЕНАЕ СЛОВА

**Белыя сцены, цені дрэў у высокіх вокнах... Архіварыус прыносіць шэрыя папкі, вы раскрываеце іх і асцярожна перагортваеце крохкія, вузкія старонкі. «Во славу Родины». Чырвонаармейская газета 3-й танкавай арміі. «Суворовский натиск». Чырвонаармейская газета 2-га Украінскага фронту. «Победа». Чырванафлоцкая газета... Радкі, пранікнутыя болем і гневам, поўныя палымянага патрыятызму і глыбокай чалавечнасці. Слова, якое вяло ў бой.**

**Дзевяць год назад у адрас кафедры гісторыі рускай літаратуры універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі прыйшло пісьмо з Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі. Супрацоўнікі ўпраўлення віталі жаданне групы студэнтаў пад кіраўніцтвам дацэнта І. Я. Заслаўскага пачаць даследаванне літаратурных матэрыялаў у вайсковым друку і радыё ваенных год і растлумачылі, як весці гэтую работу ў адпаведных архівах.**

**Патрыятычная ініцыятыва знайшла водгук у партыйнай і камсамольскай арганізацыях філалагічнага факультэта, пайшлі ёй насустрач дэканат і рэктарат. Пачалася пара сканцэнтраваных заняткаў у архівах Севастопаля, Адэсы, Падольска, работы ў газетных аддзелах бібліятэкі імя У. І. Леніна ў Маскве, Публічнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына і Цэнтральнай ваенна-марской бібліятэкі ў Ленінградзе, у бібліятэках і архівах Кіева. Пасля кожнай такой паездкі папаўнялася картатэка літаратурных матэрыялаў у вайсковай перыёдыцы і радыё (цяпер яна захоўваецца ў навуковай бібліятэцы КДУ і налічвае каля 30 тысяч картачак). Усё больш важкімі станавіліся даклады на пасяджэннях навуковага гуртка і занятках спецсемінара. Наступіў час роздуму і абагульнення.**

**Самую дзейсную і актыўную дапамогу аказалі студэнтам кваліфікаваныя бібліёграфы навуковай бібліятэкі універсітэта. Не раз яны бывалі ў розных паездках разам з маладымі даследчыкамі, вучылі іх сакрэтам бібліяграфічнага майстэрства, дапамагалі апрацоўваць сабраны матэрыял.**

**У 1971 годзе з друку выйшаў зборнік «Слова, якое вяло ў бой». У першым раздзеле зборніка— «Пісьменнікі на дарогах вайны» — змешчаны аўтабіяграфічныя заметкі Я. Далматоўскага, Л. Первамайскага, Ю. Збанацкага, М. Чабаноўскага, С. Крыжаноўскага, І. Ганчарэнкі, А. Харунжага, Б. Буркатава. Напісаныя па просьбе складальнікаў зборніка, заметкі расказваюць аб франтавым лёсе іх аўтараў, рэдакцый, у якіх яны працавалі, твораў, напісаных імі. Некаторыя публікацыі унікальныя. Гэта расказ Я. Далматоўскага аб дзейнасці рэдакцыі газеты «Звезда Советов» 6-й арміі ў першыя тры месяцы вайны. Ю. Збанацкі ўспамінае аб лёсе сваіх партызанскіх апавяданняў, якія ён чытаў услых таварышам па зброі. Рукапісы былі знішчаны выбухам снарада ў час жорсткіх баёў вясной 1943 года. «Яны ваявалі,—піша Ю. Збанацкі, — рабілі сваю справу і загінулі, як гіне воін».**

**Другі раздзел зборніка — «Заўсёды ў страі»— прысвечан класікам рускай і украінскай літаратуры, якія змагаліся разам з народам супраць фашызму. Даволі шырокае кола тэм ахопліваюць студэнцкія работы, якія склалі трэці раздзел зборніка — «Пяро, прыроўненае да штыка».**

**Зборнік «Слова, якое вяло ў бой» быў цёпла сустрэт навуковай грамадскасцю. Яго аўтары, у асноўным студэнты філалагічнага факультэта, адзначаны медалямі Усесаюзнага конкурсу навуковых студэнцкіх работ. У гэты сціплы поспех унеслі свой уклад і першыя энтузіясты, чые бібліяграфічныя разведкі ляглі ў аснову цяперашняй картатэкі. А першыя, хоць і недасканалыя, але заўсёды ўсхваляваныя паведамленні, абудзілі зацікаўленасць да тэмы франтавога друку ў першакурснікаў. Большасць аўтараў зборніка закончыла універсітэт, перадаўшы эстафету новаму пакаленню.**

**Цяпер да друку рыхтуецца новы выпуск зборніка, над якім працуюць студэнты II—IV курсаў рускага і ўкраінскага аддзяленняў факультэта.**

**Работа працягваецца. Зноў і зноў студэнты выязджаюць у архівы і бібліятэкі для новых пошукаў і знаходак. І, як заўсёды, калектыў навуковай бібліятэкі універсітэта на чале з дырэктарам, заслужаным работнікам культуры УССР Наталляй Міхайлаўнай Недаступ — іх першы памочнік у гэтай справе.**

**Літаратурны матэрыял, акумуліраваны ў захаваных камплектах вайсковага друку, вялізны. Для яго ўсебаковага і дэталёвага вывучэння недастаткова намаганняў аднаго студэнцкага калектыву філалагічнага факультэта Кіеўскага універсітэта. На жаль, на звароты ў НСТ Мінскага і Маскоўскага універсітэтаў водгук пакуль не прыйшоў. Між тым уважлівае вывучэнне мастацкага слова на старонках вайсковых газет можа ўнесці адчувальны ўклад у вывучэнне літаратуры ваеннага часу, у высакародную справу ідэйнага выхавання моладзі.**

**О. АЛЯКСАНДРАВА, А. ПУШНЯК, А. КІРЫЛЮК, студэнты філфака.**

**С. РАСАВЕЦКІ, аспірант.**

*ДА 80-ГОДДЗЯ К. Г. ПАУСТОЎСКАГА*



# ВЫДАТНЫ МАСТАК СЛОВА

31 МАЯ 1972 ГОДА спаўняецца 80 год з дня нараджэння Канстанціна Георгіевіча Паустоўскага, выдатнага пісьменніка, рамантыка па самой сваёй сутнасці, тонкага майстра слова, творчасць якога займае асобае месца ў савецкай літаратуры. Мова К. Г. Паустоўскага, яго ўменне валодаць словам выклікаюць захапленне. «Я вельмі люблю вобразны, ёмісты стыль Паустоўскага —ён чараўнік мовы», — прызнаецца Стэльмах, а Шолахаў называе яго «пісьменнікам танчэйшай назіральнасці і цудоўнага валодання дабротнай рускай мовай».

Чытаючы творы пісьменніка, кожны раз здзіўляешся прыгажосці, бясконцаму багаццю рускай мовы. Словы ў яго «цвітуць, блішчаць. Яны то шалясцяць, як травы, то бармочуць, як крыніцы, то перасвістваюцца, як птушкі, то пазваньваюць, як першы лёд, то, нарэшце, кладуцца ў нашай памяці запаволеным строем, нібы цячэнне зорак» («Залатая ружа»).

Аляксей Талстой аднойчы заўважыў: «Як наблізіцца да алмазнай мовы? Як знайсці яе? Законаў гэтай мовы няма, граматыкі такой мовы няма, і сачыніць яе нельга. Але такая алмазная мова існуе». К. Г. Паустоўскі здолеў прыблізіцца да гэтай мовы. У яго нават самыя сцёртыя і прывычныя словы ачышчаюцца ад пылу і сажы і пачынаюць свяціцца ўсімі сваімі алмазнымі гранямі. Паустоўскі дасягае гэтага незвычайнай патрабавальнасцю да мовы сваіх твораў, нейкай сваёй, празмерна высокай мерай адчуваць і разумець слова, вострым чуццём да яго. Іменна ва ўсім гэтым і заключаецца ўменне К. Г. Паустоўскага «быць чарадзеем слова, зачароўваць пявучым і раздольным гучаннем роднай рускай мовы».

Пісьменнік, які глыбока і аддана любіў Расію, яе прыроду, пазбаўленую экзатычных фарбаў, яе чараўнічую мову, быў глыбока праў, калі сцвярджаў, што «сапраўдная любоў да сваёй краіны немагчыма без любві да сваёй мовы...»

Захапляючыся рускай мовай, заклікаючы да барацьбы за яе чысціню, пісьменнік ні на хвіліну не забывае, што мова — «першаэлемент літаратуры», «асноўная зброя яе». Ён разумее, што сапраўды мастацкі твор не можа існаваць без сучаснай славеснай формы, якую можа прыдаць толькі ясная і дакладная мова, што выразнасць і дакладнасць мовы нашай літаратуры—пытанне зусім не другараднае. Гэта пытанне аб глыбіні яе думак, аб прыгажосці яе вобразаў. Славесны штамп ніколі не хвалюе, фразай, якую цяжка зразумець, нікога не пераканаеш.

Старанны адбор моўных сродкаў, імкненне да прастаты, сцісласці—вось што ў першую чаргу патрабуе К. Г. Паустоўскі ад мовы мастацкай літаратуры. Асабліва паказальныя праўкі пісьменнікам рукапісу сваіх твораў. «Чыстка» якраз адлюстроўвае барацьбу з уяўнай прыгажосцю, з налётам экзатычнасці. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, рукапіс апавядання «Марская прывіўка», дзе ўся праўка падпарадкавана іменна гэтаму прынцыпу.

Работа пісьменніка патрабуе пастаяннага ўдасканалення яго майстэрства, узбагачэння слоўнікавага запасу, і гэта выдатна разумее К. Г. Паустоўскі. Іменна таму ён заклікае пісьменнікаў вучыцца мове, «вучыцца няспынна, да апошніх дзён жыцця», вучыцца ў народа, праслаўленых пісьменнікаў, у паэтаў і мастакоў, музыкантаў і вучоных.

Бадай, больш за ўсё ўзбагачае празаіка веданне паэзіі. Таму Паустоўскі заклікае пісьменнікаў вучыцца на вобразах паэзіі.

Адной з крыніц узбагачэння празаіка з'яўляецца і жывапіс. У мастакоў вучацца пісьменнікі бачыць свет у «поўнай разнастайнасці фарбаў і колераў» («Паэзія прозы»). К. Г. Паустоўскі асуджае тых пісьменнікаў, якія пазбягаюць фарбаў і святла, таму што ад іх твораў «застаецца ўражанне пахмурнасці, шэрасці, бясплотнасці».

Творчасць самога К. Г. Паустоўскага —гэта лепшы прыклад садружнасці прозы і жывапісу. Пісьменнік валодае не такім ужо частым у сучаснай літаратуры дарам: ён бачыць свет у колеры. У яго пейзажах «на чорную воду злятае жоўтае і чырвонае лісце бяроз і асін», «блакітным крышталем загараецца ўранні Венера», «ружовы кіпрэй цвіце невысокімі сценамі» і лётаюць «аксамітавыя чмялі — чорныя з залатой палоскай на брушку».

Самая запаветная мара К. Г. Паустоўскага— «давесці слова да таго, каб яно дзейнічала на чалавека зрокавым чынам, як фарбы на палатне мастака», «ствараць рэчы бачныя, не апісваць, а паказваць рэчаіснасць, учынкі і стан людзей».

Гэта зоркасць павінна быць у вышэйшай ступені ўласціва кожнаму пісьменніку. «Той не пісьменнік,—лічыць К. Г. Паустоўскі,—хто не прыбавіў да зроку чалавека хоць бы трохі зоркасці».

З трывогай заўважаў К. Г. Паустоўскі працэс збяднення мовы некаторых пісьменнікаў, засмечванне яе недарэчнымі замежнымі словамі. Ён асуджае тых празаікаў, «якія «працуюць» усяго двума-трыма тысячамі слоў і такім чынам зводзяць нашу невычэрпна багатую мову да ўзроўню мовы самай прымітыўнай».

«Не для таго жылі і пісалі на дзівоснай рускай мове Пушкін, Леў Талстой, Горкі і Чэхаў, каб іх нашчадкі страцілі пачуццё мовы і дазволілі сабе гаварыць на агіднай і мёртвай мешаніне з дрэнна пераваранай замежнай і мовы пратакалістаў» («Паэзія прозы»)

Схіляючыся перад рускай мовай, К. Г. Паустоўскі ўсё сваё жыццё, усю сваю працу пісьменніка прысвяціў таму, каб прымусіць яшчэ ярчэй зіхацець яе алмазныя грані.

**Н. МАЖЭЙКА,**
**Н. НЯЦВЕТ.**

# Сяргей Мікалаевіч МАЛІНІН



20 мая 1972 года пасля цяжкай працяглай хваробы памёр член КПСС з 1940 года, вучоны-эканаміст, загадчык кафедры палітычнай эканоміі нашага універсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар Сяргей Мікалаевіч **Малінін**. Беларуская эканамічная навука панесла цяжкую страту.

С. М. Малінін нарадзіўся 13 чэрвеня 1907 года ў г. Мінску. У 1929 годзе закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, у 1938 годзе —завочна Маскоўскі планавы інстытут Дзяржплана СССР. У 1925—1928 гг. працаваў ў Камуністычным універсітэце БССР, у 1928—1936 гг.—у навукова-даследчым інстытуце арганізацыі і аховы працы ВЦСПС, затым у Інстытуце эканомікі АН БССР старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара, дырэктарам інстытута.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны добраахвотнікам уступіў у дзейнічаючую армію. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, Волхаўскім франтах. Быў двойчы цяжка паранен. Прайшоў шлях ад палітрука роты да лектара палітупраўлення ваеннай акругі.

З 1947 па 1953 год працаваў у апараце ЦК КПБ: намеснік начальніка упраўлення прапаганды і агітацыі, загадчык аддзела планавых, фінансавых і гандлёвых органаў. У 1953—1965 гг. узначальваў Дзяржплан БССР і адначасова быў намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР (1955 — 1958 гг.). У 1966—1969 гг. — рэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава.

З 1969 года і да апошніх дзён свайго жыцця С. М. Малінін узначальваў кафедру палітычнай эканоміі БДУ імя У. І. Леніна.

На XIX з'ездзе КПБ С. М. Малінін выбіраўся кандыдатам у члены ЦК, на XX—XXV з'ездах КПБ—членам ЦК. Ён быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР V і VI скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР III і IV скліканняў.

С. М. Малінін унёс вялікі ўклад у развіццё савецкай эканамічнай навукі. Яго пяру належыць больш 150 работ па эканоміцы і планаванню народнай гаспадаркі. Ён з'яўляецца аўтарам кніг «Праблемы эфектыўнага развіцця народнай гаспадаркі», «Эканамічная эфектыўнасць грамадскай вытворчасці», «Развіццё прамысловасці Беларускай ССР» і многіх іншых.

С. М. Малінін быў таленавітым педагогам, бліскучым лектарам і выхавацелем студэнцкай моладзі і маладых вучоных.

За вялікія заслугі перад Радзімай Сяргей Мікалаевіч Малінін узнагароджан двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і шасцю медалямі.

Светлы вобраз Сяргея Мікалаевіча Малініна, дзяржаўнага дзеяча, вучонага, педагога, чалавека вялікай душы назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**Рэктарат, партком, мясцком.**

Партыйная арганізацыя універсітэта з жалем паведамляе аб смерці персанальнага пенсіянера, члена КПСС з 1921 г. МАСТКОВА Іосіфа Якаўлевіча і выказвае глыбокае спачуванне сям'і памёршага.

**Партком.**



*НА ПАРКАВАЙ МАГІСТРАЛІ.*

*Фотаэцюд Д. ЧАХОВІЧА.*

## ТРАПНАЕ СЛОВА

● *Вялікі фізік Гобс быў вельмі замкнутым чалавекам і звычайна маўчаў на пасяджэннях вучонага савета універсітэта, у якім ён выкладаў. Але на адным пасяджэнні гэтага савета, калі вырашалася пытанне пра тое, адводзіць у новых навучальных праграмах больш месца матэматыцы ці замежным мовам, ён не вытрымаў і выступіў з прамовай.*

*— Матэматыка — вось мова!—сказаў ён.*

# ДАБРО ЗА ДАБРО

З раніцы да вечара мнагалюдна ў студэнцкай чытальнай зале. Многія студэнты на працягу ўсёй вучобы ва універсітэце пастаянныя наведвальнікі чытальнай залы. Кніжны фонд тут—25 тысяч экземпляраў. Вялікім попытам карыстаецца марксісцка-ленінская, грамадска-палітычная літаратура, пастановы ЦК КПСС.

Тры разы на тыдзень у чытальную залу паступае новая літаратура. Па запатрабаванню чытачоў літаратура дастаўляецца з кнігасховішча бібліятэкі. Асабліва ўзрастае колькасць заявак у перыяд напісання дыпломных і курсавых работ.

Да паслуг студэнтаў больш 100 назваў навуковых, тэхнічных, літаратурных і іншых часопісаў, якія атрымлівае чытальная зала.

Адкрыты доступ да кніжнага фонду, магчымасць пад кіраўніцтвам дзяжурнага бібліятэкара хутка выбраць патрэбную кнігу штодзённа прыцягвае ў чытальную залу 700—800 чалавек, а кнігавыдача складае 1 400 экземпляраў.

Дапамагаюць у рабоце нашым чытачам і алфавітны каталог фонду, картатэка часопісаў, якія атрымліваюць бібліятэка і кабінеты, картатэка прыкладнай тэматыкі палітінфармацый і гутарак сярод студэнтаў, картатэка навінак літаратуры.

Акуратна вядуцца ў нас падшыўкі газетных матэрыялаў на тэмы «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё», «Пастановы Пленумаў ЦК КПСС». Папка «Справы студэнцкія» з газетнымі выразкамі расказвае аб жыцці і вучобе студэнтаў вну краіны.

Карыстаюцца папулярнасцю чытачоў выстаўкі новых кніг і часопісаў, тэматычныя выстаўкі. З апошніх, напрыклад, можна назваць такія, як «Мы да камунізму трымаем шлях», «Навука кліча маладых», «Пісьменнікі Беларусі — выхаванцы БДУ», «У дапамогу першакурсніку».

Многа клопатаў аб студэнтах, аб тым, каб ім паспяхова працавалася, праяўляюць работнікі чытальнай залы. Хацелася б, каб і студэнты больш беражліва адносіліся да кніг, здавалі іх у належны тэрмін. Вось цяпер у нас многа запазычнікаў. Больш за ўсё з гістарычнага, фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Варта назваць самых злосных: Аляксандр Дубавец, Тамара Біч (гістфак), Валянціна Тарасевіч, Барыс Іваноў (матфак), Генадзь Маркаў, Валерый Драпеза (фізфак).

І як супрацьлеглы прыклад хочацца прывесці хімічны факультэт. Тут няма запазычнікаў. Паклапацілася аб гэтым і адказная за хімічны факультэт бібліятэкар Л. Н. Іванова. Вось такую б дысцыплінаванасць, як у студэнтаў-хімікаў, усім нашым чытачам! І тады яшчэ з большым стараннем работнікі чытальнай залы будуць дапамагаць студэнтам паспяхова рыхтавацца да экзаменацыйнай сесіі.

**Н. БАХАР,**
**ст. бібліятэкар чытальнай залы.**

**Рэдактар**
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

АТ 01224.
Зак. 621.

**Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.**
**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**
**Тыраж 2 000 экз.**